Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 КАСТРЫЧНІКА 2015 г. ПЯТНІЦА № 200 (28058) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Чалавек, які не мае перашкод

СТАР. 2



Як папярэдзіць інфаркт

СТАР. 4



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

**20 КАНАЛАЎ**

# ТЫ Ў МЯНЕ ЁСЦЬ!..



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей НАЛІВАЙКА, міністр па падатках і зборах:**

*«Сёння ў аб'ектах рознічнага гандлю ўстаноўлена каля 100 тысяч плацежных тэрміналаў. Мы, як ведамства, якое курыруе выкананне падатковага заканадаўства, выступаем за тое, каб як мага больш плацяжоў праходзіла празрыстым шляхам, а безнаяўныя плацяжы — гэта якраз той метад, які мінімізуе магчымасць (калі не сказаць, што выключае) утойвання даходаў. Нягледзячы на тое, што 100 тысяч — лічба значная, але ў агульнай лічбе ўдзельнай вагі безнаяўныя плацяжы дасягаюць 25%, у той час як мэтавы параметр Нацбанка па выніках 2015 года вызначаны на ўзроўні 50%».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.10.2015 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 17248,00 ▼ |
| Еўра | 19740,00 ▼ |
| Рас. руб. | 276,95 ▲ |
| Укр. грыўня | 796,67 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Жыллё

## АМАЛЬ ПА САБЕКОШЦЕ

### Эксперты сталічнай нерухомасці прагназуюць: стандартныя кватэры — 800 долараў за м$^2$

**Апошні раз доўгатэрміновы аналіз развіцця другаснага рынку сталічнай жыллёвай нерухомасці наша выданне рабіла сумесна з пастаянным экспертам газеты ў другой палове ліпеня. Тады мы прагназавалі, што плаўнае патанненне кватэр працягнецца толькі да сярэдзіны верасня ці максімум да першых дзён кастрычніка. Потым чакалася сезоннае ажыўленне рынку, калі нерухомасцю пачнуць цікавіцца сапраўды рэальныя пакупнікі з грашыма. Сёлета гэтыя спадзяванні работнікаў агенцтваў нерухомасці амаль не спраўдзіліся. Чарговае сур'ёзнае патанненне айчыннай валюты ў другой палове жніўня спужала патэнцыяльных кліентаў, якія пачалі адмаўляцца ад нерухомасці па завышаных цэнах у рублях. Сёння вядомы эксперт жыллёвай сферы — кіраўнік агенцтва «БелЦТН», старшыня рады Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ паспрабуе ацаніць сітуацыю на мінскім рынку жылля і скласці прагноз па ім на наступныя 3-8 месяцаў.**

СТАР. 3

■ Надвор'е

## АПОШНІ АКОРД БАБІНАГА ЛЕТА

### У нядзелю чакаецца плюс 15 і ўначы без замаразкаў



**Напрыканцы тыдня на тэрыторыі Беларусі ўсталюецца цёплае і камфортнае надвор'е, якое будзе вызначацца зонай павышанага атмасфернага ціску, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра.**

Сёння чакаецца пераменная воблачнасць і пераважна без ападкаў. Вецер паўднёва-ўсходні ўмераны, па паўднёвым захадзе парывісты. Максімальная тэмпература ўдзень плюс 8-14 градусаў. Атмасферны ціск будзе слаба падаць. І ў суботу на большай частцы краіны захаваецца ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску, толькі ў паўднёва-заходніх раёнах краіны надвор'е пачне фарміраваць атмасферны фронт, які зямышчаецца з тэрыторыі Польшчы. Будзе пераважна без ападкаў, толькі ў паўднёва-заходніх раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі магчымы туман. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе 1-8 цяпла, аднак па ўсходзе яшчэ магчымы замаразкі да 0 — мінус 3 градусаў, а ўдзень будзе 7-13 цяпла, а па поўдні — нават да плюс 14-15 градусаў.

Крыху сапсуе паласу бабінага лета няўстойлівае надвор'е ў нядзелю. Яно будзе вызначацца атмасфернымі франтамі, якія рухаюцца да нас з боку паўднёвага захаду Еўропы. Аднак, надвор'е ў гэты дзень пагоршыцца не крытычна, бо кароткачасовыя дажджы прагназуюцца толькі месцамі, а часам магчымы слабы туман. Разам з павелічэннем вільготнасці цалкам знікне пагроза замаразкаў уначы, калі мінімальная тэмпература паветра складзе ад 0 да плюс 7 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 9 цяпла. Максімальная тэмпература ўдзень чакаецца ў межах 7-13 цяпла, а па поўдні будзе нават да плюс 14-15 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# АДКАЗНАСЦЬ ПЕРАД НАРОДАМ

**«Уладзе ў цэлым, а значыць, і нам з вамі, пастаўлена высокая задача — апраўдаць давер народу, які быў прадэманстраваны чарговы раз на прэзідэнцкіх выбарах», — заявіў Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі падчас чарговага пасяджэння дзясятай сесіі верхняй палаты беларускага парламента.**

## ПЕРШ ЗА ЎСЁ — КЛОПАТ АБ ЛЮДЗЯХ

— Сёння кожны з нас павінен крытычна ацаніць узровень сваёй парламенцкай працы, акрэсліць для сябе і рэалізаваць сістэму захадаў па развіцці эканомікі і вырашэнні сацыяльных і палітычных задач, — сказаў спікер Савета Рэспублікі. — Трэба прызнаць, што наша з вамі работа на месцах можа быць больш эфектыўнай. Нам трэба садзейнічаць больш паспяховай працы прадпрыемстваў і мясцовых Саветаў дэпутатаў, вырашаць праблемы простых людзей канструктыўна, з улікам заканадаўства і мясцовых асаблівасцяў.

Асаблівую ўвагу Міхаіл Мясніковіч звярнуў на дакументы, якія стануць лёсавызначальнымі для краіны ў найбліжэйшыя гады: «На завяршальнай стадыі знаходзіцца падрыхтоўка прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспубліканскага бюджэту і асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі на 2016 год, а таксама праекта праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на чарговую пяцігодку».

Ён дадаў, што Аляксандр Лукашэнка даручыў яму «забяспечыць усебаковую прапрацоўку дакументаў» членамі Савета Рэспублікі і экспертамі ў гэтай вобласці. Па словах парламентарыя, ужо арганізавана адпаведная працоўная група, а прапановы перададзены прэм'ер-міністру Беларусі Андрэю Кабякову і старшыні праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Паўлу Калауру.

«Арыенцірам падчас працы над дакументамі для ўсіх павінна быць падтрыманая выбаршчыкамі праграма Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі, з якой ён ішоў на выбары», — зарыентаваў сенатараў Міхаіл Мясніковіч. Але ён дадаў, што пры рабоце з дакументамі трэба памятаць перш за ўсё аб праблемах і патрэбах простых людзей.

## ПАРАДАК ДНЯ

Учора Савет Рэспублікі прыняў да ведама дэкрэт Прэзідэнта Беларусі №5 «Аб замежнай бязвыплатнай дапамозе».

— У дэкрэце дэталёва прапісаны механізм па атрыманні замежнай бязвыплатнай дапамогі, у тым ліку фізічнымі асобамі, — тлумачыць новаўвядзенні **дырэктар Дэпартамента па гуманітарнай дзейнасці Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Валерый СКАКУН.** — Для іх адменена рэгістрацыя атрыманай дапамогі ў Дэпартаменце па гуманітарнай дзейнасці. Другое — яны вызвалены ад выплаты падаткаў на даходы ад атрыманай дапамогі да 200 базавых велічынь, як гэта і прадугледжана падатковым заканадаўствам.

Што тычыцца юрыдычных асоб і грамадскіх аб'яднанняў, то дэкрэт прадугледжвае пэўныя абмежаванні па ўвозе некаторых рэчаў. «Напрыклад, забаронена везці прадукты з тэрмінам прыдатнасці меншым за чатыры месяцы, медыцынскія вырабы — менш за адзін год», — дадаў ён. Па словах Валерыя Скакуна, «за пяць гадоў, уключаючы дзевяць месяцаў гэтага года, у краіну паступіў 901 мільён долараў ЗША, а за апошні год — 184 мільёны долараў».

Сенатары таксама ўхвалілі законапраект, які прадугледжвае змены правілаў у ажыццяўленні гандлю фізічнымі асобамі, якія не займаюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю.

— Сутнасць гэтага законапраекта заключаецца ў тым, што вызначаюцца віды дзейнасці, якія не адносяцца да прадпрымальніцкай, — расказвае пра навацыі **Лілія МАРОЗ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве.** — Напрыклад, у Беларусь часова прыязджае замежны грамадзянін. Ён можа гандляваць у нас у спецыяльна вызначаных месцах толькі 5 дзён на працягу каляндарнага месяца. І прадаваць можа толькі пэўны асартымент: творы жывапісу, скульптуры, графікі, прадметы народнага промыслу, а таксама прадукцыю раслінаводства і пчалярства. Гэты спіс закрыты.

Па словах Ліліі Францаўны, беларусы могуць гандляваць хоць штодзённа без абмежавання колькасці тавараў, толькі прадукцыя павінна адносіцца да ўжо пералічанай ці да сельскагаспадарчай, жывёлаводства, кветкаводства, лекавых раслін, арэхаў, грыбоў і іншых раслін, якія растуць у дзікіх умовах. «Праўда, прадаўцы павінны прад'явіць даведку аб тым, што прадукцыя жывёлаводства, раслінаводства, пчалярства выраблена, вырашчана на сваіх зямельных участках ці на надзелах родных альбо сваякоў. Такую даведку выдае выканаўча-распарадчы орган», — кажа старшыня камісіі і ўдакладняе, што стыхійныя самаарганізаваныя рынкі ўсё гэтак жа застаюцца незаконнымі, таму што адбываюцца не ў спецыяльна вызначаных для гандлю месцах.

Таксама сенатары ратыфікавала шэраг пагадненняў аб рознага кшталту міжнародным узаемадзеянні Беларусі.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

■

# НАДЗЕЙНАЯ АБАРОНА

## Палата прадстаўнікоў прыняла 11 законапраектаў

**На ўчарашнім пасяджэнні дэпутаты прагаласавалі за ўнясенне паправак у некаторыя законы па пытаннях барацьбы з тэрарызмам. Адпаведны праект закона прымаўся ў першым чытанні. Асноўныя новаўвядзенні пашыраюць спіс падстаў для правядзення антытэрарыстычнай аперацыі і накіравання на супрацоўніцтва дзяржорганаў у барацьбе з тэрарызмам.**

Як паведаміў **старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Валерый ВАКУЛЬЧЫК**, прапануецца дадаць у Закон «Аб барацьбе з тэрарызмам» норму, якая вызначае неабходнасць спынення дзейнасці тэрарыстычнай арганізацыі і мінімізацыі яе наступстваў як дадатковую падставу для правядзення контртэрарыстычнай аперацыі. Плануецца дапоўніць закон аб барацьбе з тэрарызмам нормай аб дзяржаўным рэагаванні.

— Пры гэтым дзяржаўнае рэагаванне — гэта не проста комплекс захадаў, гэта сфарміраваная на працягу апошніх гадоў на падставе рашэнняў кіраўніка дзяржавы ўстойлівая сістэма ўзаемадзеяння суб'ектаў барацьбы з тэрарызмам у крызісных сітуацыях са сваімі органамі кіравання і функцыямі, — патлумачыў выступоўца. — Уключэнне ў закон гэтага тэрміна дазволіць замацаваць і развіваць практыку арганізацыі і ажыццяўлення сумесных дзеянняў дзяржорганаў у барацьбе з тэрарызмам.

Змены і дапаўненні прапануюць таксама ўключэнне ў кампетэнцыю Міністэрства абароны ўдзел у дзяржаўным рэагаванні.

### Інфармацыя — адпаведна ўзросту

**Міхаіл ЖУРАЎКОЎ, міністр адукацыі, і дэпутат Галіна Лазоўская, член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі,** прадставілі праект закона па ўнясенні паправак у некаторыя законы. Папраўкі маюць на мэце абарону дзяцей ад інфармацыі, што прычыняе шкоду іх здароўю і развіццю.

Як патлумачыла Галіна Лазоўская падчас размовы з журналістамі, будуць адкарэктаваны законы «Аб правах дзіцяці», «Аб інфармацыі, інфарматызацыі і абароне інфармацыі», «Аб рэкламе», «Аб сродках масавай інфармацыі», «Аб выдавецкай справе ў Рэспубліцы Беларусь».

— Сутнасць законапраекта заключаецца ў тым, каб усю, за выключэннем асобных катэгорый, інфармацыйную прадукцыю падзяліць на ўзроставыя катэгорыі, — зазначыла дэпутат. — Такая класіфікацыя неабходна для таго, каб абараніць дзяцей ад інфармацыі, якая можа прычыніць шкоду іх здароўю, эмацыянальнаму і інтэлектуальнаму развіццю.

Міністр адукацыі паведаміў, што ўзроставыя катэгорыі пачынаюцца з «0+» — гэта значыць без узроставых абмежаванняў, таксама асобна выдзяляюцца катэгорыі «6+», «12+», «16+», «18+» — для дзяцей і падлеткаў, якія дасягнулі адпаведнага ўзросту.

Як паведаміла дэпутат Галіна Лазоўская, маркіроўку інфармацыйнай прадукцыі знакамі ўзроставай катэгорыі прапануецца здзяйсняць вытворцам або распаўсюджвальнікам. Для інфармацыйнай прадукцыі, якая распаўсюджваецца ў інтэрнэце, прапануецца рэкамендацыйны характар маркіроўкі. Законапраект таксама падзяляе суткі на перыяды, на працягу якіх допускаецца і не допускаецца распаўсюджванне пэўнай інфармацыйнай прадукцыі. Так, з 23 вечара да 4 гадзін ранку тэле- і радыёперадачы могуць быць пазначаны для дарослай аўдыторыі.

— Палажэнні законапраекта абавязваюць суб'ектаў, якія прадстаўляюць паслугі электрасувязі, інфармаваць сваіх кліентаў аб паслугах па абмежаванні доступу да пэўнай інфармацыі, якая ёсць у інтэрнэце, і аб сродках фільтрацыі гэтай інфармацыі, — праінфармавала Галіна Лазоўская.

Праект закона прапануе стварыць пры ўрадзе краіны грамадскую кансультацыйную раду па абароне дзяцей ад інфармацыі, якая прычыняе шкоду іх здароўю і развіццю.

### Сетка тэлевяшчання можа змяніцца

Дэпутаты вельмі зацікавіліся законапраектам па абароне дзяцей ад шкоднай інфармацыі. Многія захацелі задаць свае пытанні.

Адказваючы на пытанне **дэпутата Васіля МІХНО, члена Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы,** наконт таго, як нормы праекта закона ўзгадняюцца з адпаведным заканадаўствам іншых краін блізкага і далёкага замежжа, міністр адукацыі пацвердзіў: заможны вопыт улічваўся.

— Натуральна, мы глядзелі, якія меры прадугледжаны ў заканадаўстве еўрапейскіх краін, дзяржаў Еўразійскага саюза, Амерыкі, Канады... Амаль ва ўсіх краінах свету ёсць пэўныя законы, якія абмяжоўваюць і рэгламентуюць распаўсюджанне той ці іншай прадукцыі, доступ да інфармацыі дзяцей і вызначаюць, як бацькі, апекуны могуць уздзейнічаць на распаўсюджанне гэтай прадукцыі.

***Уладзіслаў ШЧЭПАЎ,* намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы,** заўважыў, што практыка па ўстанаўленні знакаў узроставай катэгорыі ўжо ёсць у Расіі. «Ці азначае гэта, што нашы бізнесмены, прадпрымальнікі, якія ўвозяць прадукцыю з Расійскай Федэрацыі, могуць арыентавацца на тыя ж самыя знакі?» — запытаўся дэпутат. Таксама ён пацікавіўся, ці можна чакаць змены сеткі вяшчання на нашым тэлебачанні.

— Натуральна, мы будзем арыентавацца на вопыт нашых найбліжэйшых суседзяў, асабліва Расіі, — адказаў Міхаіл Жураўкоў. — Паколькі прапануецца стварэнне грамадскай кансультацыйнай рады, то прадукцыю, што паступае, будзе разглядаць яна, арыентуючыся на прысвоеную тавару катэгорыю. Аднак я лічу, што апошняе слова ў нашай краіне павінна належаць гэтай радзе.

Адказваючы на другое пытанне дэпутата, міністр адукацыі адзначыў, што сетка вяшчання нейкім чынам будзе адкарэктавана.

— Мы ўсе глядзім тэлевізар, і не ўсё нас задавальняе, асабліва ў дзённы час, калі дзеці знаходзяцца дома адны і маюць магчымасць доступу да ўсіх тэлеканалаў. Мне асабіста як аднаму з бацькоў катэгарычна не падабаюцца некаторыя перадачы, якія ідуць у дзённы час, я іх паставіў бы ўсё ж такі ў адпаведны час вечарам ці ноччу.

### Дэпутацкая ініцыятыва

У першым чытанні таксама прынялі законапраект, што ўносіць змены і дапаўненні ў Закон «Аб турызме». Што цікава, праект закона ініцыявалі самі дэпутаты — Аляксандр Цацоха, старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, сямейнай і маладзёжнай палітыцы, Вадзім Дзевятоўскі, намеснік старшыні гэтай жа камісіі і Аляксандр Сціцко, член гэтай камісіі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■

■ У перспектыве

# ДАПАМОГА Ў ДВАЙНЫМ ПАМЕРЫ

## З наступнага года сацыяльная служба зможа выдзяляць сацработніка і сядзелку адначасова

Пра гэта паведаміў **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК.** Цяпер, згодна з пастановай Мінпрацы і Міністэрства аховы здароўя ад 10 студзеня 2013 года №3/4, сядзелка прадастаўляецца грамадзянам, якія праз свае захворванні, наступствы траўм ці дэфекты не могуць самі сябе абслугоўваць і самастойна рухацца. Аднак тыя ж медыцынскія паказчыкі не дазваляюць чалавеку карыстацца дапамогай сацработніка. Намеснік міністра патлумачыў, што змены ў пастанове №3/4, якія ўступяць у сілу з пачатку 2016 года, зробяць магчымым аказанне гэтых паслуг адначасова.

Тэрытарыяльныя цэнтры сацабслугоўвання насельніцтва прадастаўляюць сядзелку на 10-40 гадзін у тыдзень. Адзінокім недзеяздольным людзям, чый сярэднедушавы прыбытак меншы за бюджэт пражытачнага мінімуму (сёння БПМ складае каля 1,5 мільёна), гадзіна яе візіту абыдзецца ў 60 працэнтаў тарыфу на сацыяльныя паслугі. Гэты тарыф адрозніваецца ў рэгіёнах (так, на Брэстчыне ён складае чатыры тысячы рублёў). Аплата за начныя візіты, у выхадныя і святочныя дні разлічваецца на падставе сабекошту паслугі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■

■ Ведай нашых!

# З ЛІДЫ ДА ПАЛАНГІ

## праехаў на хэндбайку інвалід-калясачнік Аляксандр АЎДЗЕВІЧ

**Трапіўшы ў жудасную аварыю і страціўшы магчымасць хадзіць, ён спачатку не марыў не тое што аб падарожжы да Балтыйскага мора, а нават аб звычайнай прагулцы. А нядаўна 27-гадовы лідчанін пераадолеў на хэндбайку (па сутнасці, гэта веласіпед з педалямі, якія круцяць рукамі) больш за паўтысячы кіламетраў!**

Аляксандр накіраваўся на Балтыку разам з групай падтрымкі, якая здымала фільм аб гэтым падарожжы, але ўсе праблемы (напрыклад, з заменай шыны) вырашаў сам. За шэсць дзён праехаў 550 кіламетраў, а начаваў у хостэлах, кемпінгу, палатцы і нават у школе.

Відэаролікі з маршруту падарожнік са сваімі каментарыямі выкладваў у інтэрнэт, тым самым даказваючы, што інваліднасць — гэта не прысуд, а выпрабаванне, якое трэба і можна вытрымліваць з годнасцю. Гэтаму Аляксандр садзейнічае і як кіраўнік міжраённай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Рэспубліканская асацыяцыя інвалідаў-калясачнікаў». Разам з мясцовымі ўладамі імкнецца зрабіць Ліду горадам, дзе камфортна людзям з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі.



Дарэчы, наступным летам Аляксандр Аўдзевіч хоча здзейсніць на хэндбайку чарговае падарожжа, прычым значна больш працяглае па кіламетражы, чым да Балтыкі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■

■ Міжнародны форум

# НЕДЗІЦЯЧЫЯ ПРАБЛЕМЫ ДЗЯЦІНСТВА

**Удасканаленне якасці адукацыі дашкольнікаў і забеспячэнне яе даступнасці для ўсіх, сучасныя падыходы да фінансавання дашкольных устаноў і падрыхтоўка для іх педагагічных кадраў, стварэнне здароўезберагальнага асяроддзя і ўкараненне ў дашкольную адукацыю інклюзіі — усе гэтыя тэмы аказаліся ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў міжнароднага форуму «Развіццё сістэмы дашкольнай адукацыі: інвестыцыі ў будучыню», які адкрыўся ўчора ў сталіцы.**

Да ўдзелу ў дыскусіі былі запрошаны больш як 270 спецыялістаў з 10 краін: Расіі, Казахстана, Латвіі, Малдовы, Арменіі, Таджыкістана, Балгарыі, Францыі і Нідэрландаў.

— Вызначаючы праблемнае поле міжнароднага форуму, мы найперш улічвалі сучасныя напрамкі дашкольнай адукацыі ў свеце і тыя пытанні, якія абмяркоўваюцца цяпер на самым высокім узроўні, — падкрэсліла ў сваім прывітальным слове да ўдзельнікаў форуму **намеснік міністра адукацыі Раіса СІДАРЭНКА**. — Беларуская сістэма дашкольнай адукацыі не можа існаваць ізалявана. Да нашага досведу праяўляюць цікавасць калегі з многіх краін далёкага і блізкага замежжа.

**Начальнік аддзела дашкольнай адукацыі Міністэрства адукацыі Альбіна ДАВІДОВІЧ** агучыла некалькі лічбаў, якія характарызуюць сучасны стан развіцця дашкольнай адукацыі ў нашай краіне. Выдаткі на сістэму дашкольнай адукацыі складаюць у Беларусі 1 працэнт ад унутранага валавога прадукту. Гэты паказчык з'яўляецца адным з самых высокіх у Еўропе і Паўночнай Амерыцы. Для параўнання: у Даніі ён складае 1,3 працэнта, Францыі — 1 працэнт, Швецыі — 1 працэнт, Нарвегіі — 0,8 працэнта, Канадзе — 0,2 працэнта, ЗША — 0,35 працэнта. У 2014 годзе на ўтрыманне ўстаноў дашкольнай адукацыі з бюджэту было выдаткавана 7,6 трлн рублёў, у 2015 годзе плануецца выдзеліць 9,2 трлн рублёў. Гэта 20% ад агульных бягучых выдаткаў на адукацыю.

Міжнародныя эксперты канстатуюць, што ў Беларусі традыцыйна адзін з самых высокіх у Еўропе паказчыкаў па ахопе дзяцей ва ўзросце да трох гадоў дашкольнай адукацыяй — 35,9 працэнта, у тым ліку ў сельскай мясцовасці — 19,9 працэнта. Ахоп дзяцей ад 1 да 6 гадоў установамі дашкольнай адукацыі складае па краіне 74,4 працэнта (у сельскай мясцовасці — 49,7 працэнта). А падрыхтоўкай да школы ахоплены ўсе 100 працэнтаў дзяцей пяцігадовага ўзросту.

Бацькамі запатрабаваныя новыя формы арганізацыі дашкольнай адукацыі: групы кароткачасовага знаходжання, сезонныя і гульнявыя пляцоўкі, прагулачныя групы, вячэрнія групы, групы выхаднога дня, адаптацыйныя і г.д. Функцыянуе 2899 такіх груп, якія наведваюць амаль 26 тысяч дзяцей. Ёсць у краіне 11 прыватных устаноў дашкольнай адукацыі.

Існуе і шэраг нявырашаных пытанняў. У прыватнасці, у чарзе на прадастаўленне месца ў дзіцячым садку сёння стаяць больш як 17 тысяч дзяцей дашкольнага ўзросту — гэта дзеці, якім не змаглі на момант звароту прадаставіць месца ў дзіцячым садку па месцы жыхарства сям'і. Праблема ў забеспячэнні ўстаноў дашкольнай адукацыі крокавай даступнасці актуальная найперш для мікрараёнаў-новабудоўляў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Добрая навіна

## ПРАЕЗД У СТАЛІЦЫ СЁЛЕТА ДАРАЖЭЦЬ НЕ БУДЗЕ

**Пра гэта паведаміла намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс» Ірына Якубоўская.**

У прыватнасці яна адзначыла, што пытанне аб павышэнні да канца года тарыфаў на праезд у грамадскім транспарце Мінска пакуль нават не разглядаецца. Аднак намеснік гендырэктара не выключыла верагоднасці павышэння кошту праезду ў грамадскім транспарце горада ўжо наступнага года. Цяпер гэтае прадпрыемства па запыце Мінэканомікі зрабіла разлікі на 2016 год, дзе разглядаецца магчымасць павышэння кошту аплаты за праезд.

Трэба нагадаць, што гарадскія транспартныя паслугі носяць сацыяльны характар, таму «Мінсктранс» не мае права прымаць самастойна рашэнне аб павышэнні тарыфу на праезд. Тарыфы на гарадскія перавозкі пасажыраў усімі відамі транспарту ў рэгулярных зносінах зацвярджае Мінгарвыканкам па ўзгадненні з Мінэканомікі.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# АМАЛЬ ПА САБЕКОШЦЕ

## ПОПЫТ НЕ СЯБРУЕ З ПРАПАНОВАЙ

Нагадаю, што яшчэ ў першай палове года, калі толькі стартавала ўпэўненае патанненне жылля, колькасць прапановы пастаянна павялічвалася. Уласнікі жылля спрабавалі прадаць свае «квадраты» да таго часу, пакуль рынак яшчэ канчаткова не прасеў. А ў выніку ў пачатку лета аб'ём прапановы дасягнуў свайго гістарычнага максімуму. Тады, паводле інфармацыі партала Realt.by, агульны спіс прапановы ў Мінску складаў больш за 11 тысяч кватэр і асобных жылых памяшканняў. Аднак проста выставіць сваё жыллё на продаж — гэта яшчэ не значыць, што яго абавязкова купяць па заяўленым кошце.

Так і адбылося. Да апошняга часу рынак амаль стаяў, калі пакупнікі патрабавалі сур'ёзных зніжак, але прадаўцы масава на гэта не згаджаліся. Увогуле, гэтым летам у Мінску прадавалася выключна невялікае па плошчы таннае жыллё. А не дачакаўшыся сваіх пакупнікоў і восенню, пэўная частка прадаўцоў пачала здымаць сваё жыллё з продажу і накіроўваць у структуру доўгатэрміновай арэнды. Паводле інфармацыі Мікалая Праставупава, сёння прапанова крыху звузілася і колькасць яе на рынку складае каля 9 тысяч кватэр і пакояў.

Між іншым, спецыяліст адзначае, што і ў гэтым аб'ёме прапановы кватэр з рэальным рынкавым коштам не вельмі і шмат. Спецыяліст упэўнены, што прыкладна 80% гаспадароў выстаўляюць цяпер на продаж сваё жыллё па цане, якая ажно на 5-10 тысяч долараў вышэйшая за сярэднюю рэальную на рынку.

## ЁСЦЬ АДНАПАКАЁЎКІ І ЗА 35-40 ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ

Сёння на другасным рынку сталіцы назіраецца нават нейкае супрацьстаянне цэн прапановы і рэальных пры продажы жылля. Напрыклад, аналітычна-інфармацыйнае выданне «Нерухомасць Беларусі» прыводзіць сярэднія цэны прапановы, дзе квадратны метр агульнай плошчы ў аднапакаёвай кватэры складае 1490 долараў. У двухпакаёўках «квадрат» прапануецца за 1430 долараў, а ў трохпакаёўках — за 1395 долараў. Кожны тыдзень падобны цэннік прапановы памяншаецца недзе на 10-15 долараў. Але і гэта сёння не самае цікавае. Рэальныя цэны, па якіх цяпер ажыццяўляюцца здзелкі, маюць зусім іншы памер. Цяпер аднапакаёвыя кватэры і сапраўды могуць разлічваць на пакупніка толькі ў тым выпадку, калі канчатковы кошт квадратнага метра будзе складаць у дыяпазоне ад 1200 да 1250 долараў. Двухпакаёўкі будуць рэальна разглядацца патэнцыйнымі кліентамі пры цэнніку за «квадрат» ад 1130 да 1230 долараў, а трохпакаёўкі ад 1000 да 1130 долараў.

Менавіта таму ў каталогу прапановы пачалі з'яўляцца невялікія па плошчы (30-33 кв. м.) аднапакаёвыя кватэры са стартавым цэннікам да 40 тысяч, а часам і за 34-36 тысяч долараў. Зразумела, што зусім танныя кватэры прапануюцца выключна на першых паверхах старых пяціпавярховых дамоў. Падобнае па плошчы жыллё ў панэльных дзевяціпавярховых дамах каштуе ўжо ад 42 да 47 тысяч долараў. Між іншым, хапае ў рэкламных праспектах і слабенькіх па якасці кватэр з прапіскай у спальных раёнах сталіцы, кошты на якія дасягаюць 55-60 тысяч долараў. Спецыялісты адзначаюць, што кліенты на падобнае жыллё ўвогуле не звяртаюць увагу, а значыць, яно трапляе ў ранг «вісякоў».

## З'ЯВІЛІСЯ І ДВУХПАКАЁЎКІ ДА 50 ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ

Менавіта ў час працяглага патанення нерухомасці на сталічным рынку пачынаюць сустракацца экзатычныя па планіроўцы і мінімальныя па плошчы двухпакаёвыя кватэры. Мне нават цяжка ўявіць двухпакаёўку з агульнай плошчай ад 32 да 37 квадратных метраў і кухняй да 5 «квадратаў». Гэта жыллё ў даволі старых дамах сёння ставіць рэкорды па мінімальным кошце двухпакаёвак у Мінску — 44-46 тысяч долараў.

Даволі шмат прапаноў па стандартных двухпакаёвых кватэрах у панэльных дамах. Такое жыллё агульнай плошчай да 49 квадратных метраў выстаўляецца на продаж ужо па кошце ад 50 да 56 тысяч долараў. Калі плошча падобнага жылля пераскоквае мяжу ў 50-56 квадратных метраў, тады і цэннік на яго дасягае ўжо дыяпазону ў межах ад 60 да 70 тысяч долараў. Хапае на рынку двухпакаёвых кватэр з цэннікам ад 80 да 120 тысяч долараў. І гэта зусім не абавязкова цалкам «упакаваныя» кватэры або жылыя памяшканні ў элітных дамах. Часам па такім кошце прапануецца і зусім стандартнае жыллё ў цэнтральных раёнах сталіцы.

Мацней за ўсё за апошняе паўгоддзе патаннелі шматпакаёвыя кватэры. Сёння на рынку існуе невялікая колькасць трохпакаёвых кватэр, якія прапануюцца па кошце 58-60 тысяч долараў. Гэта не лепшае па якасці жыллё з маленькімі кухнямі, аднак квадратны метр у такіх кватэрах каштуе ўжо толькі крыху больш за тысячу долараў. Найбольшая колькасць прапановы бюджэтных трохпакаёвак цяпер мае стартавы цэннік ад 65 да 80 тысяч долараў. Існуе цяпер на другасным рынку і даволі свежае жыллё ў новабудоўлях мікраёна Каменная Горка. Там па вуліцах Нёманская і Каменнагорская прапануюцца трохпакаёвыя кватэры вялікіх плошчаў (каля 100 квадратных метраў), у якіх стартавы цэннік усяго аб'екта паказвае, што жыллёвы квадрат каштуе ўжо менш за тысячу долараў. А гэта ўжо знакавы «званочак» на далейшае патанненне і іншай нерухомасці на другасным рынку жылля, лічыць наш эксперт.



## «ДАЛЁЎКА» ТАННЕЕ ХУТЧЭЙ

Цяпер на першасным рынку сталічнага жылля існуе шмат цікавых прапаноў на самы розны густ. Зразумела, што танней за ўсё па лініі долевага будаўніцтва прапануюцца кватэры ў дамах, узвядзенне якіх толькі арганізуецца на стадыі катлавана. Напрыклад, у будучым доме жылога комплексу па вуліцы Максіма Багдановіча квадратны метр агульнай плошчы прапануецца ад 850 долараў. Прапанова і сапраўды цудоўная, калі не ўлічваць той факт, што дом будзе здадзены ў эксплуатацыю не раней апошняга квартала 2016 года. Існуюць тут і плюсы, бо дамы ўзводзяцца не панэльныя, а маналітна-каркасныя, прадугледжаны падземны паркінг, а ў кватэрах — двухкамерныя шклопакеты.

Для тых, хто згодны жыць не зусім у межах горада, а літаральна побач, існуе ўвогуле цудоўная прапанова па бюджэтных варыянтах. У жылым комплексе «Вясёлка», які будуецца ў аграгарадку Прылукі (8 кіламетраў ад МКАД) будзе ўзведзена ажно 36 шматкватэрных панэльных дамоў. А разам з імі пабудуюць дзіцячыя садкі, школы і гандлёвыя цэнтры. Комплекс разлічаны менавіта на чаргавікоў сталіцы. У гэтых дамах цэннік будаўніцтва аднапакаёвых кватэр з плошчай у межах 42-43 квадратных метраў прапануецца з разліку кошту квадрата ў межах 880 долараў.

**Двухпакаёўкі будуць рэальна разглядацца патэнцыйнымі кліентамі пры цэнніку за «квадрат» ад 1130 да 1230 долараў, а трохпакаёўкі ад 1000 да 1130 долараў**

Квадратны метр невялікіх па плошчы двухпакаёвых і трохпакаёвых кватэр тут каштуе нават 780 долараў. Зразумела, што кватэры ў гэтых дамах будуць здавацца ў эксплуатацыю не сёння ці заўтра і без адстрочвання. Відавочна, што мінусаў у аб'екта хапае, аднак галоўным плюсам з'яўляецца яго мінімальны кошт.

Існуе цікавая прапанова пры будаўніцтве двух каркасна-блочных дамоў па вуліцы Нававіленскай. Тут квадратны метр розных тыпаў кватэр мае стартавы кошт ад тысячы долараў. Гэтай восенню распачаўся сезон акцый і зніжак нават у элітным жылым комплексе «Прэстыжына», дзе магчыма пабудаваць кватэры па кошце квадратнага метра ад 1500 да 2500 долараў.

## ПЕРАДНАВАГОДНЯГА ЎСПЛЁСКУ ПОПЫТУ НЕ БУДЗЕ

У мінулыя гады ў сталіцы менавіта на два апошнія месяцы года прыпадала максімальная актыўнасць пакупнікоў жылля на другасным рынку. Сёлета падобнай хвалі спецыялісты ўжо не чакаюць. Цяпер у Нацыянальным агенцтве па рэгістрацыі нерухомасці за месяц фіксуецца каля 500-600 здзелак куплі-продажы кватэр. Здаецца, што аб'ём і не вельмі маленькі, але... Даволі вялікая колькасць здзелак цяпер ажыццяўляецца па лініі шматступеньчатых абменаў, дзе жывыя грошы прысутнічаюць у мінімальных памерах. А вось чыстых пакупак на другасным рынку сустракаецца ўсё менш. Больш за тое, частка патэнцыйных пакупнікоў гатовага жылля пачынае адмаўляцца ад другаснага рынку, бо вырашае займацца будаўніцтвам больш сучаснага і адначасова таннейшага жылля.

## ЦЭНАВАЕ ДНО ЧАКАЕЦЦА НАСТУПНЫМ ЛЕТАМ

Далейшае патанненне кватэр на другасным рынку жылля прагназуецца нашым экспертам мінімум да пачатку лета. Мікалай Праставупаў амаль упэўнены, што арганізатары долевага будаўніцтва вымушаны будуць узводзіць у Мінску больш стандартнага масавага жылля ў выглядзе дамоў панэльнага тыпу. Больш за тое, на фоне мінімальнага попыту забудоўшчыкі пачнуць прапаноўваць кліентам кватэры толькі крыху даражэй за іх сабекошт. У выніку кошт квадратнага метра для кліентаў у панэльных дамах можа знізіцца нават у межах горада да 750-800 долараў.

Такую выснову наш эксперт робіць пасля аналізу апошніх тэндэнцый, якія назіраюцца на жыллёвых рынках у рэгіёнах. Так, сёння ў Віцебску і Гомелі пачалі з'яўляцца новабудоўлі, дзе кліентам прапануюць кватэры з коштам квадратнага метра ў межах 650-700 долараў. Тэму там і на другасным рынку кошт жыллёвага квадрата знізіўся да 500-700 долараў.

Зразумела, што ў Мінску камерцыйнае жыллё будуецца з рознымі абцяжараннямі, таму сабекошт дамоў тут будзе крыху даражэйшы, чым у абласных цэнтрах. Мікалай Праставупаў лічыць, што ў сталіцы мінімальны кошт квадратнага метра стандартнага жылля складзе на ўзроўні каля 800 долараў. Гэта і будзе той канчатковае цэнавае дно на другасным рынку жылля Мінска. Пасля эксперты чакаюць перыяд стабільных мінімальных цэн, а потым і наступную хвалю ажыўлення рынку.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Здаровае сэрца

# ПАЧНІЦЕ СЁННЯ!



**Дзесьці кожны трэці-чацвёрты дарослы суайчыннік жыве з паталогіяй сістэмы кровазвароту — у яго ёсць артэрыяльная гіпертэнзія, ішэмічная хвароба сэрца або цэрэбра-васкулярнае захворванне. Усё гэта здольна аднойчы прывесці да сардэчнай катастрофы, інфаркту міякарда. А пачынаецца ўсё з гіпертаніі, павышанага артэрыяльнага ціску, якому можна і трэба процістаяць. Пачніце сёння.**

Павышаны артэрыяльны ціск — важны фактар не толькі інфаркту, але і інсульту, сардэчнай недастатковасці, парушэння функцый нырак, захворвання перыферычных артэрый, удакладняе **загадчык кафедры кардыялогіі і рэўматалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Андрэй ПРЫСТРОМ.** Гіпертанія можа быць і ў маладым узросце, але рэдка. Звычайна праблема нарастае з гадамі, але што можна проціставіць старэнню? Толькі здаровы лад жыцця ў маладым узросце. Іначай — не толькі высокі ціск, але і цукровы дыябет, атлусценне, павышаны халестэрын крыві вам забяспечаны...

Першае, што неабходна сэрцу — збалансаванае, разнастайнае харчаванне. Важна ўжываць дастатковую колькасць садавіны (200 г у суткі) і гародніны (мінімум 200 г на дзень). Так званыя транстлушчы, тэхналогія вырабу якіх прымушае назваць іх штучнымі, неабходна істотна абмежаваць, паколькі менавіта яны з'яўляюцца шкоднымі для здароўя. Так што трэба абмяжоўваць маргарын!

Важна не пераядаць. Лішак тлушчаў і простых вугляводаў (цукру) у ежы спрыяе набору вагі. А гэта і рост ціску, і павышаны ўзровень халестэрыну. А вось зніжэнне масы цела на 1 кг — гэта зніжэнне ціску на 1 мм рт. сл. Лішняя вага — гэта і рызыка развіцця цукровага дыябету 2 тыпу. А гэта захворванне само па сабе значна павялічвае рызыку інфаркту.

Цяпер пра соль. Даказана, што рызыка развіцця сардэчна-сасудзістых захворванняў і рост смяротнасці ад такой паталогіі цесна ўзрастаюць на фоне ўжывання лішку солі, незалежна ад таго, які ў вас ціск. Рэкамендаваная доза — да 5 г паваранай солі ў суткі. Адна чайная лыжка — гэта 7-10 г. У 100 г сыравэнджанай каўбасы — амаль 2 г солі, у адным бігмаку — 1 г. Спецыялісты адзначаюць, што распаўсюджванне салення, кансерваў, фастфуду прывяло да павышэння парога адчувальнасці да солі — скажэння салявой адчувальнасці, а таму нават вельмі салёнае нам здаецца не атрутным, а смачным.

**«Алкаголь вядомы сваім таксічным уздзеяннем на ўвесь арганізм, але пры хранічным злоўжыванні больш за ўсё церпіць сэрца».**

— Калі дарослыя ў сям'і пакутуюць ад сардэчна-сасудзістай паталогіі, той жа гіпертаніі, то дзеці ад нараджэння павінны прывучацца да істотнага зніжэння солі ў рацыёне, — кажа **загадчыца лабараторыі артэрыяльнай гіпертэнзіі РНПЦ «Кардыялогія» Вольга ПАЎЛАВА.** — Рэкамендуецца таксама ўжо з 3 гадоў кантраляваць ціск, а з 6-ці — тлумачыць аб шкодзе дрэнных звычак у якой-небудзь гульнявой форме...

Дарэчы, пра шкодныя звычкі. Шырока распаўсюджаныя сёння электронныя цыгарэты лічацца выдатным спосабам пазбаўлення ад курэння традыцыйнага. Аднак шэраг даследаванняў паказваюць, што электронныя цыгарэты абсалютна гэтаму не спрыяюць! Больш за тое, у аэразолі электроннай цыгарэты змяшчаецца высокатаксічны нікацін, які выклікае больш хуткае развіццё псіхічнай і фізічнай нікацінавай залежнасці. У падлеткаў, якія не курылі звычайных цыгарэт, літаральна з першых спроб «электроннага» курэння развіваецца нікацінавая залежнасць. Небяспечныя яны і для навакольных, паколькі змяшчаюць цэлы набор шкодных рэчываў, у тым ліку цяжкіх металаў кшталту волава, медзі, нікелю...

Наогул людзі, якія знаходзяцца ў адным памяшканні з курцамі, працэнтаў на дзевяноста атрымліваюць той жа шкодны эфект. Некаторыя даследаванні ўказваюць на прамую сувязь паміж забаронай курэння ў грамадскіх месцах і змяншэннем колькасці інфарктаў. У дзяцей і падлеткаў курэнне з'яўляецца наймагутнейшым фактарам развіцця сардэчна-сасудзістай паталогіі — больш магутным, чым няправільны тлушчавы абмен.

Айчынныя спецыялісты адзначаюць, што калі папуляцыя перастане злоўжываць алкаголем, то адна толькі гэта акалічнасць дазволіць знізіць смяротнасць на 25 працэнтаў. Алкаголь вядомы сваім таксічным уздзеяннем на ўвесь арганізм, але пры хранічным злоўжыванні больш за ўсё церпіць сэрца. Выкід адрэналіну і норадрэналіну (падчас ужывання спіртнога) выклікае тахікардыю (сэрцабіццё), павышае ціск, а значыць, набліжае інфаркт. Лічыцца, што толькі 20-30 мл спірту ў дзень для мужчын (і ўдвая менш для жанчын) зніжае частату інфарктаў. Аднак! Гэта не зніжае частату інсультаў, суіцыдаў, траўмаў, анкалагічных захворванняў, страўнікава-кішачных крывацёкаў і г.д.

**«Зніжэнне масы цела на 1 кг — гэта зніжэнне ціску на 1 мм рт. сл».**

Фізічная нагрузка павінна быць дастатковай — 150 хвілін на тыдні. Хадзіце пешшу штодня хаця б 20-30 хвілін. На жаль, нават маладое пакаленне перажывае сур'ёзны дэфіцыт руху. Толькі 10 працэнтаў хлопцаў-падлеткаў і 5 працэнтаў дзяўчат атрымліваюць дастатковую фізічную нагрузку.

Стрэсы, дэпрэсія таксама даюць значны прырост захваральнасці на інфаркт. Трэба вучыцца пераадольваць розныя сітуацыі. Калі здаецца, што сіл на гэта няма, варта шукаць дапамогі ў спецыялістаў.

**Лабараторыя артэрыяльнай гіпертэнзіі ў апошнія тры гады актыўна даследуе сувязь генетычных і паводзінавых фактараў рызыкі. Паводле папярэдніх вынікаў, у некаторых выпадках развіццё артэрыяльнай гіпертэнзіі напалову абумоўлівае генетыка. Але паводзіны, уплыў навакольнага асяроддзя маюць не меншае значэнне. Так, ужо ўдалося выявіць, што чалавек са спадчыннай схільнасцю да гіпертаніі істотна павялічвае шанцы займець яе, калі мае лішнюю вагу.**



# ІНФАРКТ МОЖНА ПАПЯРЭДЗІЦЬ

**Штогод у краіне выяўляецца каля 16 тысяч інфарктаў. Каля палавы пацыентаў з такім дыягназам вельмі позна звяртаюцца па медыцынскую дапамогу. Між тым сучасныя тэхналогіі дазваляюць пры своечасовым звароце папярэдзіць развіццё сардэчнай катастрофы. З дапамогай, напрыклад, трамбалітычнай тэрапіі, рэнтгенэндаваскулярнага ўмяшання, стэнтавання. Галоўнае — трапіць у поле зроку ўрача цягам шасці гадзін (пры інсульце, дарэчы, яшчэ менш — цягам трох) з пачатку з'яўлення характэрнага болю, які пры інфаркце можа аддаваць у руку, сківіцу, хоць у розных людзей сардэчны боль можа праяўляцца па-рознаму. Важна разжаваць аспірын, падкласці пад язык нітрагліцэрын і выклікаць «хуткую дапамогу».**

Паводле слоў **намесніка дырэктара па арганізацыйна-метадычнай рабоце РНПЦ «Кардыялогія» Аляксандра ПАЦЕЕВА**, можна прадухіліць інфаркт, калі як мага раней раскрыць каранарную артэрыю і забяспечыць крываток. Можна з дапамогай сучасных тромбалітычных сродкаў (трамбалізіс можа выконвацца і супрацоўнікамі «хуткай дапамогі» на дашпітальным этапе), але самым эфектыўным сучасным спосабам з'яўляецца рэнтгенэндаваскулярны, калі пад рэнтгенаўскім кантролем да бляшкі, якая перакрыла крываток, падводзіцца катэтар і ў гэтым месцы устанаўліваецца стэнт, дзякуючы якому аднаўляецца рух крыві. Калі гэтага не будзе, то частка сэрца пацерпіць без кіслароду і спажыўных рэчываў і загіне, а стэнт забяспечвае сэрцу другое жыццё. Колькасць такіх умяшанняў год ад года расце.

Летась было выканана звыш 7 тысяч рэнтгенэндаваскулярных умяшанняў. Пры гэтым колькасць аортакаранарнага шунціравання сасудаў сэрца крыху зніжаецца — 1608, а ў 2013-м — 1634. Расце год ад года і колькасць імплантацый электракардыястымулятараў — 3252 аперацыі за год. Усяго летась праведзена звыш 15 тысяч аперацыйных умяшанняў на сэрцы і грудной аорце, што на 16 працэнтаў больш, чым у папярэднім годзе. Да 80 працэнтаў аперацый на сэрцы і буйных сасудах выконваюцца ў рэгіёнах, аднак каля 70 працэнтаў найбольш складаных умяшанняў выконваецца ў навукова-практычным цэнтры «Кардыялогія». Мяркуецца, што сёлета ўдасца правесці звыш 15,5 тысячы аперацый.

У першым паўгоддзі гэтага года адзначаецца павелічэнне колькасці хворых з інфарктам міякарда. Кожны трэці пацыент паступіў позна — праз 12 гадзін ад пачатку прыступу, калі інфаркт ужо адбыўся.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*


БЕЛАРУСБАНК

## ОФИЦИАЛЬНАЯ ТАБЛИЦА

**«Восемьдесят четвертого тиража выигрышей по выигрышным вкладам в белорусских рублях», состоявшегося 08 октября 2015 года в г. Минске.**

Выигрыши выпали на следующие номера счетов по выигрышным вкладам во всех учреждениях ОАО «АСБ Беларусбанк»:

| Номера счетов | Размер выигрыша в процентах к средней сумме остатка вклада | Номера счетов | Размер выигрыша в процентах к средней сумме остатка вклада |
|---|---|---|---|
| A012 | 112 (Сто двенадцать) | A551 | 112 (Сто двенадцать) |
| A078 | 112 (Сто двенадцать) | A590 | 112 (Сто двенадцать) |
| A081 | 112 (Сто двенадцать) | A638 | 112 (Сто двенадцать) |
| A133 | 112 (Сто двенадцать) | A646 | 900 (Девятьсот) |
| A180 | 225 (Двести двадцать пять) | A690 | 112 (Сто двенадцать) |
| A204 | 450 (Четыреста пятьдесят) | A720 | 112 (Сто двенадцать) |
| A259 | 112 (Сто двенадцать) | A763 | 112 (Сто двенадцать) |
| A288 | 112 (Сто двенадцать) | A829 | 450 (Четыреста пятьдесят) |
| A331 | 112 (Сто двенадцать) | A847 | 112 (Сто двенадцать) |
| A382 | 112 (Сто двенадцать) | A897 | 225 (Двести двадцать пять) |
| A409 | 112 (Сто двенадцать) | A946 | 112 (Сто двенадцать) |
| A461 | 112 (Сто двенадцать) | A995 | 112 (Сто двенадцать) |
| A484 | 112 (Сто двенадцать) | - | |

В учреждениях ОАО «АСБ Беларусбанк», где число счетов более одной тысячи, во всех последующих тысячах выиграли те же номера, что и в первой тысяче, т. е. за №№ A012, A1012, A2012 и т.д.

**Председатель комиссии:**
Дарья Юрьевна Давидович
Главный специалист управления архитектуры и строительства администрации Заводского района г. Минска

**Ответственный секретарь:**
Татьяна Александровна Ясинская
Заместитель директора департамента розничного бизнеса ОАО «АСБ Беларусбанк»

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь. Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.


# ПАДЗЯЛІЦЦА РАДАСЦЮ

**Учора ў Савеце Рэспублікі адкрылася выстава карцін аднаго з супрацоўнікаў верхняй палаты беларускага парламента — Міхаіла КАПЫЛЬСКАГА. Для сваіх калег ён начальнік экспертна-прававога ўпраўлення Сакратарыята Савета Рэспублікі. У вольны час — мастак. 22 прадстаўленыя ім палотны — гэта пейзажы і нацюрморты, якія тонка перадаюць прыгажосць і адметнасць беларускай прыроды.**





Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Творчасць узбагачае жыццё, — разважае Міхаіл Паўлавіч. — А калі ў цябе ёсць магчымасць адлюстраваць свае ўражанні на паперы, на палатне — гэта вялікая радасць, якой хочацца дзяліцца са сваімі роднымі, блізкімі людзьмі, сябрамі, калегамі, што я з задавальненнем і раблю.

Па словах мастака, яго натхняе малая радзіма — вёска Лошніца, што на Барысаўшчыне. Міхаіл Капыльскі прызнаецца, што сёння самае складанае ў стварэнні карцін — адшукаць час паміж штодзённымі клопатамі і дзяржаўнымі справамі. Па яго словах, карціны пісаліся цягам апошніх дзесяці гадоў. Мастацкай адукацыі Міхаіл Паўлавіч не мае, але малюе ўжо тры дзесяцігоддзі: «Жывапіс дапамагае пaглядзець на свет іншымі вачыма, усвядоміць усё хараство беларускай прыроды і асэнсаваць, як важна яе зберагчы для нашых нашчадкаў».

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

TV@R

Мікалай ПРАКАПОВІЧ:

# «НАЙПЕРШ ВА ЎСІМ ШУКАЮ БЕЛАРУСКАСЦЬ»



**Людзі, адданыя сваёй малой радзіме, — асаблівыя. Іх непаўторнасць праяўляецца ў шчырай любові да свайго роднага, у сіле не здрадзіць гэтаму пачуццю ў пагоні за славай, высокімі заробкамі і перспектывай. Мікалай Пракаповіч якраз з такой кагорты. Сёння ён працуе вядучым праграмы «Край з Міколам Пракаповічам» на ТРК «Брэст», дзе расказвае пра народную культурную спадчыну і тых герояў, якія захоўваюць яе набыткі і традыцыі. Мы сустрэліся з Мікалаем Мікалаевічам, каб даведацца, як пісалася яго ўласная творчая гісторыя на тэлебачанні...**

## ВЁСКУ ЎЖО ЦЯЖКА НАЗВАЦЬ ЗАХАВАЛЬНІЦАЙ ТРАДЫЦЫЙ

***— У народзе кажуць, дзе нарадзіўся, там і згадзіўся... Як для вас пачыналіся пошукі свайго шляху ў жыцці?***

— Прызнацца, у мяне ніколі не ўзнікала асаблівага жадання з'ехаць у Мінск. Хоць і праблемы такой не існавала. Калі я яшчэ актыўна працаваў як паэт, то, натуральна, што ў Мінску ўсё было б прасцей. І надрукавацца, і выдаць кніжку. Але нехта з іх ніхто не застаўся... Але неяк і я, і некаторыя з маіх сяброў, што засталіся, — Алесь Каско, Зінаіда Дудзюк — на сваёй зямлі натуральна сябе пачуваем. Мне таксама тут утульна і добра ва ўсіх адносінах. Я ўвогуле чалавек, які прывязаны да аднаго месца. Радзіма для мяне — гэта радзіма. І Брэст мой родны горад, хоць я вясковец. Прыгарад Брэста за Мухаўцом раней быў вёскай Пугачова... Там практычна пачуў і пабачыў тое, чым займаюся сёння на тэлебачанні: народныя традыцыі, песні, святы. Бегаў за калядоўшчыкамі, сам шчадраваў, бываў на вясковых вяселлях. І я знаёміўся з такім Палессем, якое мне здавалася сапраўдным па тым часе. Потым паехаў настаўнічаць на Піншчыну. Бо Піншчына — гэта ж Колас і яго «На ростанях»! Прысутнічала ў гэтым пэўная рамантыка. Хацелася пабачыць тыя ж Люсіна, Пінкавічы. Накіраванне было ў Асобавічы — вёска на беразе Прыпяці. Цікавая сітуацыя склалася пры першым маім з ёю знаёмстве. Я прыехаў якраз з будаўнічага атрада. Узяў таксі з Брэста ў Пінск і пытаю ў таксіста, як дабрацца да Асобавічаў. А той кажа: «Верталётам!» І гэта быў жарт толькі напалову — я плыў туды цеплаходам 4 гадзіны. Было бабіна лета, цёплае надвор'е. На палубе трое дзяўчат спявалі палескую песню. «Ой віць, віць, цёх-цёх, там салавейка шчабятаў...» Цеплаход прычаліў ноччу. Да вёскі дабіраліся брадамі, па пояс у вадзе...

***— Месца, дзе вы нарадзіліся, цяпер стала ўжо часткай горада. Што для вас вёска сёння?***

**Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента в составе, определенном пунктом 8 Инструкции о порядке представления и публикации участниками рынка ценных бумаг отчетности и иной информации, утвержденной постановлением Министерства финансов Республики Беларусь от 21 декабря 2010 г. № 157 «О некоторых вопросах представления и публикации участниками рынка ценных бумаг отчетности и иной информации» (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2011 г., № 12, 8/23164), информация о принятом решении о реорганизации или ликвидации эмитента либо о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве), о внесенных изменениях в проспект эмиссии (далее – периодическое печатное издание), а также сроки их публикации:**
Наименование периодического печатного издания: газета «Звязда».
Публикация бухгалтерской отчетности Эмитента проводится не позднее 31 марта года, следующего за отчетным.
Публикация о реорганизации или ликвидации Эмитента либо о возбуждении в отношении Эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) проводится в сроки, определенные действующим законодательством.
Публикация о внесенных изменениях в проспект эмиссии проводится не позднее 7 (Семи) дней с момента регистрации таких изменений в регистрирующем органе.

**Депозитарий, обслуживающий Эмитента:**
Унитарное предприятие по ценным бумагам «ЭСПАС» (далее – «Унитарное предприятие «ЭСПАС»), зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 30 июня 2000 г. № 733, в ЕГР за № 100302205.
Местонахождение: 220036, Республика Беларусь, город Минск, переулок Домашевский, д. 11 А, ком. 709, 710.
Унитарное предприятие «ЭСПАС» имеет лицензию Министерства финансов Республики Беларусь № 02200/5200-124-1115 на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам. Лицензия действительна до 29.07.2022 г.

**Права и обязанности акционеров при выпуске акций:**
Акционеры – владельцы простых (обыкновенных) акций вправе:
участвовать в собрании акционеров (далее – Собрание) с правом голоса по вопросам, относящимся к компетенции Собрания;
распоряжаться принадлежащими им акциями в порядке, установленном законодательством и уставом Эмитента;
получать информацию о деятельности Эмитента и знакомиться с его документацией в объеме и порядке, установленных уставом Эмитента;
передавать свои полномочия по участию в управлении деятельностью Эмитента иным лицам путем выдачи доверенности либо заключения договора в порядке, установленном законодательными актами;
получать часть прибыли Эмитента в виде дивидендов в случаях, размере и порядке, установленных законодательством и настоящим уставом;
получать в случае ликвидации Эмитента часть имущества, оставшегося после расчетов с кредиторами, или его стоимость в размере и порядке, установленных законодательством и уставом Эмитента.
Акционеры – владельцы простых (обыкновенных) акций обязаны:
соблюдать требования устава Эмитента;
исполнять решения Собрания и Совета директоров;
исполнять принятые на себя обязательства по отношению к Эмитенту;
вносить в уставный фонд Эмитента вклады в порядке, размерах, способами и в сроки, предусмотренные уставом Эмитента;
не разглашать конфиденциальную информацию о деятельности Эмитента, полученную в связи с участием в Эмитенте;
немедленно сообщать депозитарию, формирующему реестр владельцев ценных бумаг Эмитента, обо всех изменениях данных о себе, включенных в реестр;
выполнять иные обязанности, связанные с участием в Эмитенте, предусмотренные законодательными актами и уставом Эмитента.

**Размер зарегистрированного уставного фонда Эмитента:**
248 628 052 400 (Двести сорок восемь миллиардов шестьсот двадцать восемь миллионов пятьдесят две тысячи четыреста) рублей.

**Количество акций по категориям и типам привилегированных акций, номинальная стоимость акции:**
Акции простые (обыкновенные) – 2 689 150 (Два миллиона шестьсот восемьдесят девять тысяч сто пятьдесят) штук.
Акции привилегированные – 0 (Ноль) штук.
Номинальная стоимость акции – 92 456 (Девяносто две тысячи четыреста пятьдесят шесть) рублей.

**СВЕДЕНИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОЙ ПОДПИСКИ НА АКЦИИ**

Решение об увеличении уставного фонда путем выпуска дополнительных акций, размещаемых путем проведения открытой подписки, принято внеочередным общим собранием акционеров Эмитента, протокол № 37 от 10.09.2015.

**Основные цели эмиссии и направления использования средств, полученных в результате проведения открытой подписки на акции:**
Основные цели эмиссии – обеспечение реализации программы технического перевооружения, стабилизации финансово-экономического положения и пополнения собственных оборотных средств Эмитента за счет привлечения временно свободных денежных средств физических и юридических лиц.
Средства, полученные от размещения акций, будут использованы в соответствии с целями их выпуска.

**Планируемый объем эмиссии:**
Планируемый объем эмиссии: 48 077 120 000 (Сорок восемь миллиардов семьдесят семь миллионов сто двадцать тысяч) белорусских рублей.

**Количество, категории и типы привилегированных акций, размещаемых при проведении открытой подписки на акции:**
Простые (обыкновенные) акции – 520 000 (Пятьсот двадцать тысяч) штук.
Привилегированные акции не выпускаются.

**Номинальная стоимость акции, цена подписки на акции:**
Номинальная стоимость акции составляет 92 456 (Девяносто две тысячи четыреста пятьдесят шесть) белорусских рублей.
Открытая подписка на акции осуществляется в белорусских рублях, цена подписки на одну акцию составляет 92 456 (Девяносто две тысячи четыреста пятьдесят шесть) белорусских рублей.

**Место и время ознакомления с проспектом эмиссии акций:**
- 220005, город Минск, улица Гикало, 5, отдел кадров ОАО «Амкодор-Белвар», ежедневно, кроме выходных, с 10.00 до 16.00, тел. +375 17 293 97 57, факс +375 17 331 41 97.
- 220036, город Минск, переулок Домашевский, д. 11А, ком. 710, УП «ЭСПАС», ежедневно, кроме выходных, с 10.00 до 16.00, тел. +375 17 213 58 55.

**Порядок расчета и выплаты дивидендов по акциям:**
Эмитент вправе, за исключением случаев, установленных пунктом 17.4. устава Эмитента, распределять между акционерами часть прибыли, остающейся в его распоряжении после уплаты налогов и иных обязательных платежей и покрытия убытков текущих периодов, образовавшихся по вине Эмитента, посредством выплаты дивидендов, а в случаях и порядке, установленных законодательными актами, Эмитент обязан выплачивать дивиденды. Эмитент вправе производить выплату дивидендов по результатам первого квартала, полугодия, девяти месяцев и по результатам года. Дивиденды выплачиваются только по размещенным акциям.
Решение о выплате дивидендов, периоде, за который выплачиваются дивиденды, и размере дивидендов принимается Собранием.
Дивиденды, решение о выплате которых принято, должны быть выплачены в срок не позднее 180 (Ста восьмидесяти) дней со дня принятия решения об объявлении и выплате дивидендов, если решением о выплате дивидендов, принятым большинством не менее двух третей от числа голосов лиц, принимающих участие в Собрании, не установлен меньший или больший срок выплаты дивидендов.
Объявленные дивиденды выплачиваются в кассе Эмитента и (или) путем перечисления денежных средств (дивидендов) на счета акционеров, открытые в банках и (или) небанковских кредитно-финансовых организациях.
Список акционеров, имеющих право на получение дивидендов, составляется на основании данных того же реестра владельцев ценных бумаг, на основании которого был составлен список лиц, имеющих право на участие в Собрании, принявшем решение о выплате соответствующих дивидендов.
Эмитент не вправе принимать решения об объявлении и выплате дивидендов, а также выплачивать дивиденды, если:
уставный фонд оплачен не полностью;
стоимость чистых активов Эмитента меньше суммы его уставного фонда и резервных фондов либо станет меньше их суммы в результате выплаты дивидендов.
Эмитент имеет устойчивый характер неплатежеспособности в соответствии с законодательством об экономической несостоятельности (банкротстве) или если указанный характер появится у Эмитента в результате выплаты дивидендов;
не завершен в соответствии со статьей 15 устава Эмитента выкуп акций Эмитента по требованию его акционеров.
Порядок объявления и выплаты дивидендов Эмитента в части, не урегулированной уставом Эмитента, определяется локальным нормативным правовым актом Эмитента, который утверждается Собранием.

**Место и время проведения открытой подписки на акции:**
220005, г. Минск, проспект Независимости, 58, бухгалтерия, ежедневно, кроме выходных, с 9.00 до 16.00, тел. +375 (17) 293-97-82.

**Период и порядок проведения открытой подписки на акции:**
На первом этапе, в период с 19 по 28 октября 2015 года, Эмитентом осуществляется сбор предложений (заявок) от лиц, намеревающихся приобрести акции в ходе подписки.
На втором этапе, в период с 29 октября 2015 года по 31 марта 2016 года, осуществляется заключение договоров подписки на акции.
В случае если общее количество акций, указанное в поступивших предложениях (заявках) на первом этапе подписки, превышает планируемый объем эмиссии, договоры подписки заключаются с инвесторами, представившими свои предложения первыми.
Вкладом подписчика в уставный фонд Эмитента могут быть только денежные средства.
Основным документом, определяющим отношения подписчика и Эмитента, является договор подписки на акции, заключенный по месту проведения подписки в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь, и с соблюдением условий подписки.
В договоре подписки на дополнительные акции в обязательном порядке должны быть указаны реквизиты участников сделки, количество, категория, вид и номинальная стоимость приобретаемых по подписке акций, цена приобретения акций и общая сумма сделки в белорусских рублях, сроки и порядок взаимных расчетов, права и обязанности сторон сделки, их ответственность за нарушение условий договора, порядок перехода прав собственности на акции.
По взаимному согласию сторон в договор могут включаться и другие условия, однако содержание договора не может противоречить условиям подписки.

**Условия досрочного прекращения открытой подписки на акции:**
Досрочное прекращение подписки предусматривается в случае достижения подпиской размера планируемого уставного фонда.
В случае если общее количество акций, указанное в поступивших предложениях (заявках) на первом этапе подписки, превышает планируемый объем эмиссии, договоры подписки заключаются с инвесторами, представившими свои предложения в порядке очередности.
В случае не достижения при подписке на акции размера планируемого уставного фонда Собрание утверждает размер уставного фонда с учетом фактических результатов подписки.
В заключении договора подписки на акции может быть отказано в случаях несоблюдения подписчиком условий подписки либо иных требований, установленных законодательством Республики Беларусь.
Открытая подписка на акции может быть признана несостоявшейся по одному из следующих оснований:
- не будет заключено ни одного договора подписки на продажу хотя бы одной акции Эмитента;
- при запрещении выпуска ценных бумаг регистрирующим органом в случаях, предусмотренных законодательными актами.
При запрещении выпуска ценных бумаг регистрирующим органом внесенные по подписке денежные средства возвращаются подписчику не позднее 30 дней с даты принятия соответствующего решения.
При отказе от выпуска дополнительных акций средства, внесенные по подписке, возвращаются инвестору в месячный срок с даты принятия соответствующего решения.
Под отказом от выпуска дополнительных акций подразумеваются следующие действия, факты и обстоятельства:
- отказ уполномоченного государственного органа в регистрации изменений устава Эмитента с учетом выпуска дополнительных акций;
- отказ уполномоченного государственного органа в государственной регистрации дополнительных акций.

Генеральный директор ОАО «Амкодор-Белвар» Д.П. Барташевич

Главный бухгалтер ОАО «Амкодор-Белвар» В.Г. Чернышева

---

Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!

**Совместное белорусско-российское ОАО «Белгазпромбанк»**
220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2. Телефон для справок: 120

Данная отчетность опубликована на сайте ОАО «Белгазпромбанк» www.belgazprombank.by в разделе «Финансовые показатели»

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2015 г.
ОАО «Белгазпромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2015 год | 2014 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 735 564 | 456 615 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 6 213 | 6 611 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 1 941 824 | 2 885 815 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 1 393 498 | 501 022 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 6 912 442 | 2 578 193 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 16 043 454 | 9 911 860 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 249 287 | 919 549 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 170 | 148 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 1 148 742 | 575 431 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 8 690 | 1 667 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | | 305 417 | 202 278 |
| 14 | **ИТОГО активы** | **11** | | **28 745 301** | **18 039 189** |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | 824 226 | 327 989 |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 6 000 151 | 4 441 389 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 17 522 041 | 9 517 872 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 673 711 | 798 833 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 21 199 | 144 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 184 784 | 102 230 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 25 226 112 | 15 188 457 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 1 252 269 | 1 252 269 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 357 582 | 280 902 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 197 686 | 213 855 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 1 711 652 | 1 103 706 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 3 519 189 | 2 850 732 |
| 31 | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **28 745 301** | **18 039 189** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 октября 2015 г.
ОАО «Белгазпромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2015 год | 2014 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 2 259 598 | 1 442 465 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 1 362 284 | 734 058 |
| 3 | *Чистые процентные доходы* | 201 | | 897 314 | 708 407 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 347 152 | 318 427 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 81 131 | 105 802 |
| 6 | *Чистые комиссионные доходы* | 202 | | 266 021 | 212 625 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 4 998 | 1 722 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 61 589 | 22 424 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 654 434 | 16 580 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 251 522 | 96 886 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 632 276 | 130 822 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 102 110 | 131 033 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 596 859 | 415 788 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 55 903 | 43 320 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 952 950 | 599 747 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 178 606 | 86 610 |
| 17 | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **774 344** | **513 137** |

**Председатель правления** **В.Д.Бабарико**

**Главный бухгалтер** **Т.М.Пивовар**

**Дата подписания: 7 октября 2015 г.**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 8 выдана Национальным банком Республики Беларусь 24.05.2013.
УНП 100429079




## ЯК Я КАРОВУ «ПРАПІЛА»

...Света па жыцці была аптымісткай, трохі авантурысткай і цудоўнай арганізатаркай. Не скажу, што мы з ёй блізка сябравалі (яна за мяне маладзейшая), але ж адносіны былі добрыя. Я часта забягала да яе не толькі як да галоўнай бухгалтаркі з нейкімі вытворчымі пытаннямі. Часцяком заходзіла проста так — пагаманіць, душу, як кажуць, адвесці.

Дык вось адчыняю аднойчы дзверы, а яна мне адразу:

— Іванаўна, ты ці заўважыла — даўно ў нас ніякіх свят не было!.. Дык чаму б твой юбілей не адзначыць?.. Мы з дзяўчатамі ўсё прадумалі... Зараз — твая чарга.

Ну вось... А я ж чакала, што ўсе забудуцца, што неяк пранясе. Бо зарплаты ў калгасе тады малыя былі (ды і тыя выплачвалі месяцы праз два). Адпаведна — грошай ва ўсіх як кот наплакаў... А ў мяне да таго ж і дочкі студэнткі — вучы іх як хочаш, дапамагай. У людзей надзея хоць на кароў была: здавалі малако дзяржаве, за яго плацілі... У нас жа і гэных прыбыткаў не стала: захварэла карміцелька — лячылі-лячылі яе ды ўсё без толку — прыйшлося здаць.

Думаю я вось гэтак, а ўголас Свеце кажу:

— Павер: не да юбілею мне...

Тая ў адказ:

— Іванаўна, я нічога не ведаю і ведаць не хачу! Да таго ж — мы ўжо скінуліся, грошы сабралі, падарунак купілі... На табе спіс гасцей...

Глянула ў яго і ледзь не самлела: 50 чалавек там — усе галоўныя і не галоўныя спецыялісты, бухгалтэрыя, сельскі Савет, брыгадзіры паляводчых брыгад... З раёна некалькі асоб...

І што з гэтым рабіць?

Ад думак аж галава пухне...

Праўда, якраз тады грошы за карову прыйшлі. Вырашыла: ат, была ні была (іншага ж выйсця нямашака) — закупіла правіянт, наняла кухарку...

Пагулялі, карацей, «па поўнай праграме»: і елі, і пілі, і спявалі, і танчылі...

Назаўтра зайшла да Святланы, а там па-ранейшаму дым каромыслам: жанчыны абмяркоўваюць, як было, што было, з кім... Рагочуць, аж заходзяцца! Урэшце кажуць:

— Дзякуй, Іванаўна! Такое свята ўсім зрабіла! Мы так пагулялі!..

Я ў адказ:

— Яшчэ б... Калі карову прапілі...

Сказала і сказала — ціха, жартам, сама сабе. Думала, ніхто не пачуў. Аж не. Праз дзень-другі прыходзіць да мяне Святлана:

— Я ўсё прадумала, — кажа, — і нават узгадніла. Кароў са статка калгас, вядома ж, не прадае, але добрым працаўнікам і ў выключным выпадку праўленне можа пайсці насустрач. У цябе карова хварэла? Хварэла. Ты здала яе не ад добрага жыцця? Не ад добрага... Ёсць сведкі, ёсць дакументы. Застаецца толькі заяву напісаць... А выплачваць будзеш потым — пакрысе, з кожнай зарплаты...

Карацей, у хуткім часе на падворку ў нас з'явілася новая карміцелька.

Ці шкадавала тую я? Вядома ж... А вось грошы — не, бо юбілей і сапраўды прайшоў добра: ёсць што ўспомніць — і мне, і, спадзяюся, людзям.

**Соф'я КУРЦІН,**

*г.п. Лынтупы, Пастаўскі раён.*

## «БЫЎ ЧАС, БЫЎ ВЕК, БЫЛА ЭПОХА...»

Згадзіцеся, праўду пісаў наш класік: многае раней было па-іншаму — неба вышэйшае, рэчкі глыбейшыя, лясы багацейшыя, а ўжо марозіва — і куды таннейшае (28 капеек!), і, як сведчыць рэклама, нашмат смачнейшае...

Што ўжо казаць пра людзей?! Мы і сапраўды не такія былі, як цяперашняя моладзь: больш наіўныя і рамантычныя, больш духоўныя, чыстыя... Кажуць, у тыя часы ўзімку адзін падлетак свой дзень народзінаў адсвяткаваў і да бацькоў, з пытаннем: вы, маўляў, казалі, што дзяцей у капусце знаходзяць альбо бусел прыносіць. А як жа я — адкуль узяўся? На двары ж зіма, адпаведна — ні буслоў, ні капусты...

Не чула, што яму адказалі «продкі», але добра памятаю, як маю суседку па студэнцкім інтэрнаце адлічвалі некалі з інстытута: не за прагулы, не за дрэнную паспяховасць — яна «заляцела», як той казаў.

Цяпер цяжарныя дзяўчынкі нават у школы ходзяць. І нічога — вучацца.

Пра тэлевізар я наогул маўчу. Маці маёй каляжанкі неяк гаварыла, што зусім па-іншаму сваё жыццё пражыла б, калі б некалі пабачыла тое, што паказваюць цяпер... (Хоць як на мой розум — дык многага і не варта было б паказваць!)

Ёсць, карацей, свае мінусы, свае плюсы. Але ж гэта так — уступ да маёй гісторыі. А цяпер — яна сама.

Я тады жыла ў студэнцкім інтэрнаце, вучылася на другім курсе інстытута. І, здаецца ж, нідзе не парэзалася, не загнала стрэмку, але палец на руцэ... Спачатку ён засвярбеў, потым патаўсцеў, як тая сардэлька, потым стаў сінець... Факт, што нашуся я з ім як поп з гармонікам, бо ні посуд памыць, ні падлогу (дзяўчаты ўжо касавурацца)... А далей — болей: канспекты пісаць не магу, спаць... І да доктара ісці баюся.

Не ведаю, колькі б так цягнулася, калі б не наша інтэрнацкая медсястра. Згледзела яна мяне ў калідоры (а можа, і сумысля падышла — можа, дзяўчаты ёй падаслалі?) і, глянуўшы на «больку», як усходзіцца: ты што, маўляў, сабе думаеш, з глузду з'ехала — хочаш без пальца застацца ды на правай руцэ, а то і без рукі, калекай?! Марш у паліклініку!..

Паслухала. Іду туды — нібы на Галгофу, бо там жа не толькі палец трэба паказваць, там перш-наперш трэба флюараграфію прайсці. І гінеколага. З першым — ніякіх праблем, кожны год праходзіла, ведаю, а вось другое...

Паперку (тое накіраванне) трымаю ў руцэ ды сама сабе думаю: «Не, не была я раней у гэтага доктара і зараз не пайду». І цягу з паліклінікі. А пакуль да варот дайду, — усе словы медсястры ўспомняцца, зноў жа на палец свой «налюбуюся» (раптам сапраўды адрэжуць?) і назад вярнуся...

Колькі вось так маячыла — ад дзвярэй да варот — ужо не помню. Факт, што... зраўлася пры гэтым: так мне страшна было! А потым (і вось такая — твару аніякага...) прыплялася-такі пад дзверы гінеколага.

Чарга, убачыўшы мяне, паважліва расступілася — прапусціла наперад (гора ж у дзяўчыны!)

Як не сваімі нагамі заходжу ў кабінет. Гінеколаг — камень з душы — жанчына! І таксама чалавек, відаць: адразу ж насустрач. Пытае:

— Што з табой, мілая? Ну не плач так... І не бойся — я нікому нічога не скажу!

Тут я і наогул уголас зараўла: падумала, што ж тут такое робіць, каб потым пра гэта яшчэ і нікому не расказваць?

Насілу доктар супакоіла мяне, папрасіла раздзецца.

Я ўзялася блузку расшпільваць...

І на крэсла садзілася няправільна.

Карацей, гінеколаг вельмі доўга са мной праваджалася. А потым задала некалькі пытанняў, паглядзела і што называецца рукамі развяла. Маўляў, нічога не разумею: чаго ж ты так убіваешся, калі ніякіх прычын няма?..

Толькі тады, крыху пасмялеўшы, я паказала ёй... хворы палец.

Вось такія мы былі ў свае 18, 20, а то і 50 гадоў. Не тое, што цяпер у 15.

**Г.У.,**

*г. Смаргонь.*

## КРАДЗЕНЫМ СЫТЫ НЕ БУДЗЕШ

З канца верасня дзве тысячы... (ці так важна, якога года?) трое ўжо не вельмі маладых сяброў з невялікага беларускага гарадка сталі думаць, як ім зімаваць. Ні ўласных лецішчаў, ні родзічаў у вёсцы ніхто з іх не меў, грошай на тое, каб садавіну ды гародніну купіць на рынках — таксама...

Хтось падказаў: непадалёк, на палетках прыгараднага калгаса, пасля ўборкі засталося шмат морквы. І нікому як быццам яна не патрэбна, «дрэнна ляжыць». Разведалі сябрукі, дзе канкрэтна тое поле знаходзіцца, і аднойчы на веласіпедах накіраваліся на промысел.

Недзе праз паўгадзіны «здабытчыкі» былі на месцы. Веласіпеды пакінулі ва ўзлеску, а самі пашыбавалі ў поле да ледзь прыкметных у прыцемку куч маркоўнага бацвіння. Па дарозе ўбачылі, што морква там таксама была. І нямала...

Збіралі (а недзе і выбіралі...) яе спехам, ледзь не навобмацак — не разглядаючы, складалі ў мяшкі. У паўзмроку заўважылі, што гэтым жа «промыслам» непадалёк займаюцца дзве кабеты. Павесялелі: не мы адны! Таму хутка ў лепшым настроі і з досыць важкім здабыткам пакіравалі да веласіпедаў, а потым — і ў бок горада. Але пры гэтым не расслабляліся.

— Нельга, хлопцы, — даводзіў Васіль, — сцеражонага Бог сцеражэ. Я чуў — па сельскіх дарогах даішнікі ездзяць: правяраюць, ці не вязе хто крадзенае.

— Не можа такога быць, — не верыў яму Міхась, — мала што чалавек можа везці? За руку ж не злоўлены? Не! Значыць, не злодзей... Калі што — неяк адбрэшамся.

Трэці з сябрукоў, Уладзя, у гэта верыў і не верыў, бо метраў праз сто сказаў:

— Хлопцы, вы сабе едзьце, а я вунь за тыя кусцікі збочу... Потым даганю вас.

Як сказаў, так зрабіў: веласіпед з ладным мяшком на багажніку пакінуў у высокай траве на ўзбочыне, сам шмыгануў у лазняк і там затрымаўся. Хлопцы праз колькі метраў сталі, каб яго пачакаць... Як раптам бачаць — фары машыны бліснулі, пачуўся гул... А ў страху ж вочы па яблыку: Васіль з Міхасём — з дарогі, куляй... Веласіпеды ў траву, самі таксама. Ляжаць і, здаецца, не дыхаюць, бо абодвум падалося, што на тым аўтамабілі, апроч фар, яшчэ і міліцэйская мігалка свеціцца. А гэта ж «капец»... Поўны... Тым больш што машына яшчэ здалёк стала прытармозваць — і якраз там, дзе збочыў Уладзя, дзе застаўся яго веласіпед з морквай і дзе ў любое імгненне мог з'явіцца ён сам.

— Ну ўсё, нам канцы, пагарэлі! — жахнуўся Міхась, бо ў святле аўтамабільных фар добра бачыў, што Уладзя (машыны ён не чуў ці што?) як нічога ніякага, на хаду зашпіляючы дзягу, сунецца ў бок дарогі.

— Добры вечар! — гукнуў яму кіроўца машыны.

Уладзя стаў як укапаны.

— Вы не скажаце, — працягваў мужык, — на Старынкі я правільна еду? Гэта туды?

— Т-т-т-уды, — так і не паспеўшы ачомацца, рукой паказаў сябрук.

Машына тут жа кранулася з месца і праз колькі імгненняў знікла ў цемры. Хлопцы, з палёгкай уздыхнуўшы, выйшлі на дарогу.

Уладзя — таксама, але крыху пастаяўшы, пабег назад у кусты...

І потым як ні ўгаворвала яго жонка матанушца з тымі ж сябрамі і ў той жа калгас па буракі ці капусту, не ўгаварыла: не паехаў і ўсё. Крадзеным, сказаў, сыты не будзеш.

**С. ВАСІЛЬЧУК,**

*г. Узда.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

■ Неасабісты суб'ектыў



# АБ БЕДНЫМ «ТАНКІСЦЕ» ЗАМОЎЦЕ СЛОВА...

## Пра матрыярхат, паламанае крэсла і сенцы без падлогі

АПЕРАТАР мабільнай сувязі запусціў новы тарыфны план і разгарнуў з гэтай нагоды шырокую рэкламную кампанію. З вялікіх білбордаў і малых лістовак на цябе — хочаш ты таго ці не — проста вывальваецца танк. Абяцанні аператара спакуслівыя: гуляць у гэтыя самыя «танкі» цяпер можна і на смартфоне, прычым добры адрэзак часу бясплатна, дакладней, за кошт абаненцкай платы. Да таго ж кожны, хто падключыцца, атрымае баявую машыну ў падарунак...

Убачыўшы гэту рэкламу, я тут жа са спачуваннем падумала пра некалькіх сваіх знаёмых, у якіх мужы-«танкісты». Цяпер яны будуць мець магчымасць «ваяваць» не толькі седзячы за камп'ютарам, але і трымаючы ў руках тэлефон. Смешна? Толькі на першы погляд, здалёк. «Мой таксама гуляе. Адрываеш — раве як шалёны, на дзяцей асабліва. Да кампа падысці магу толькі раненька. Вочы расплюшчыў — ужо сядзіць. Вельмі цяжка адарваць. Апошнім часам магу адарваць толькі дзякуючы рамонту ў новай кватэры. Пераехаць не можам ніяк таму, што там няма "Танкаў" пакуль... Што рабіць — не ведаю. Некалькі разоў яму казала, што ён не бачыць рэальнага жыцця, што, нягледзячы на тое, што ён дома, яго няма з намі. Што мне даводзіцца ўсё цягнуць самой, а дапамогі і падтрымкі я не адчуваю, а бо ў нас трое дзяцей, мне вельмі нялёгка бывае. Часам здаецца, што ён разумее, пачынае дапамагаць у чымсьці, потым зноў зрываецца. У меру гуляць не атрымліваецца — усё ці нічога. Капец поўны...»

Падобных споведзяў (ці крыкаў душы?) на жаночых форумах — сотні. Гэтаксама як і парад, як блізкага чалавека ад гэтай залежнасці ратаваць. Досыць банальных, трэба сказаць. Кшталту найміце таго, хто заблакіруе ўваход у сістэму, зацікаўце мужа чым-небудзь іншым, папрасіце яго што-небудзь зрабіць па гаспадарцы. Мая прыяцелька папрасіла свайго «танкіста» пабыць з чатырохмесячным сынам, пакуль яна сходзіць у магазін. Вярнуўшыся, убачыла карціну: малое, прывязанае ў «кенгуру», скача і гугукае ў таты на жываце, тата — скача і гугукае за камп'ютарам. «Ваюе» яе «танкіст» адмыслова: лаецца, нават ламае мэблю — камп'ютарнае крэсла доўга такіх скокаў не вытрымлівае...

НЕХТА скажа: у нашых мужчын занадта спакойнае і мірнае жыццё, а ў іх у генах закладзена змагацца за месца пад сонцам. Вось яны і знаходзяць выйсце сваёй ваяўнічай нерастрачанай энергіі (пра гэта вельмі шмат цяпер пішуць еўрапейскія аналітыкі, шукаючы тлумачэнне, чаму ад дабрабыту і заходняга сытага жыцця тамтэйшыя мужчыны едуць ваяваць на баку тэрарыстаў). А мне здаецца, справа ў іншым. Нашым мужчынам проста не трэба змагацца ў рэальным жыцці. Месца пад сонцам і для іх, і для сям'і, і для саміх сябе адваявалі жанчыны. Спачатку агрэсіўна адсунуўшы мужчын на другі план, а пасля ласкава дазволіўшы ім назіраць за гэтай барацьбой, утульна ўладкаваўшыся на канапе. Учора быў тэлевізар і газета, сёння — камп'ютар і «танкі», заўтра — яшчэ нешта, дзе яны будуць у сваёй талерцы, моцнымі і самадастатковымі, гаспадарамі становішча, дзе іх не будуць «дзяўбсці» за няўвагу да сям'і, за малую зарплату, за непрыстасаванасць да жыцця. Пры гэтым дэманстратыўна забіваючы цвікі, камандуючы дзецьмі, цягнучы некалькі ставак на працы (маўляў, а што мне бедняй рабіць, калі мой лайдак толькі за камп'ютарам і прападае).

Наўрад ці такая статыстыка існуе, але я амаль упэўнена: сярод заўзятых «танкістаў» пераважная большасць — людзі сямейныя. На халастых не вісіць стапудовай гірай адчуванне вінаватасці і ўласнай нікчэмнасці — гэты цяжар дастаецца ім у нагрузку пад гукі вальса Мендэльсона. Халастыя хутчэй гэтыя самыя «танкі» ці нешта падобнае спраграмуюць, пагуляюць крыху дзеля забавы і ператвораць у камерцыйны праект, які дазволіць рабіць немалыя грошы на жаданні тысяч мужчын адарвацца ад рэальнасці, у якой на бытавым узроўні ўжо поўны матрыярхат.

У ГЭТЫМ плане вельмі паказальная гісторыя адбылася гадоў пяць назад з маімі знаёмымі. У іх у сенцах падлога прагніла і прагніцца пачала. Купілі новыя дошкі, а замяніць — ну ніяк рукі ў гаспадара не даходзілі. То праца, то футбол па тэлевізары, то ў хляве ўходжваецца, то на рыбалку. Жонка спачатку прасіла тую падлогу замяніць, потым пачала бубнець (як вы здагадваецеся, безвынікова). Тады, уздыхнуўшы цяжка (з гэтым нашым вечным жаночым: «а што мне, бедняй, рабіць...»), пакуль муж у горад па справах ездзіў, сама тую падлогу старую садрала і новыя дошчачкі акуратна — адна да адной — прыбіла.

Што, вы думаеце, зрабіў яе гаспадар, вярнуўшыся? Сварыцца не стаў, каяцца — таксама. Проста ўзяў сякеру і гэтыя дошчачкі акуратна — адна ад адной — паадздзіраў і на месца паклаў. Тыдні два ў сенцах па лагах скакалі, пакуль МУЖЧЫНА не ВЫРАШЫЎ, што трэба падлогу нарэшце пакласці, і за пару гадзін гэтага не зрабіў. Яго палавіна моўчкі пакорліва чакала, і гэта была навука ёй на ўсё астатняе жыццё.

У ІХ дома стаіць добры камп'ютар, ёсць і планшэт. Ці гуляе муж у «Танкі»? «Што яму, больш рабіць няма чаго?!» — з непрыхаванай гордасцю адказала яго «палавінка»...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

■

■ Філатэліст

## ВЕДАЙ СВАІХ

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь 16 кастрычніка выпускае ў абарачэнне новыя паштовыя маркі з серыі «Амфібіі». На іх нашы земнаводныя: квакша звычайная, жарлянка чырванабрухая, а таксама жабы — травяная і сажалкавая.



Мастак «Амфібій» — Аляксандр Міцянін, дызайн — Марыны Віткоўскай. У дзень выпуску серыі ў сталічным аддзяленні сувязі №1 (крама «Філатэлія», вул. Маскоўская, 16) як заўсёды адбудзецца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

Да «Амфібій» падрыхтаваны і карткі для картмаксімумаў.

# «МУЗЫКА НА ВАДЗЕ» І КАНЦЭРТ РЭПЕРА І ХІП-ХОПЕРА

## Тыдні Германіі ў Беларусі сталі ўжо традыцыйнай асенняй падзеяй у культурна-мастацкім жыцці краіны

**Сёлета яны маюць юбілейна-святочны характар. Па-першае, Тыдні праходзяць ужо ў 10-ты раз. Па-другое, яны прысвечаны 25-годдзю аб'яднання Германіі. Падзея ў жыцці нямецкага народа знамянальная і вартая таго, каб пра яе падрабязна расказаць і замежным сябрам, у тым ліку і сродкамі мастацтва. У юбілейны год гэтая тэма лейтматывам будзе гучаць амаль ва ўсіх мерапрыемствах праграмы.**

Як адзначыў пасол ФРГ у Беларусі Петэр Дэтмар, Тыдні зноў стануць выдатнай магчымасцю для жыхароў нашай краіны пазнаёміцца з кінамастацтвам і музыкай, тэатральнымі пастаноўкамі і літаратурнымі навінкамі, наведаць фотавыставы, канцэрты і іншыя мерапрыемствы не толькі ў Мінску, але і ў Оршы, іншых гарадах.

Дарэчы, у правядзенні Тыдняў задзейнічаны вялікія сілы: супрацоўнікі Пасольства ФРГ, прадстаўнікі Інстытута імя Гётэ ў Мінску, інфармацыйнага бюро Германскай службы акадэмічных абменаў (DAAD), Цэнтральнага ўпраўлення па справах школьнай адукацыі за мяжой і Мінскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра імя Іаханеса Рау і інш. Зразумела, актыўны ўдзел ва ўсіх культурна-масавых мерапрыемствах Тыдняў возьмуць удзел і беларускія партнёры, адзначыў Петэр Дэтмар.

Асалоду атрымаюць аматары класічнай музыкі. Асабліва хочацца звярнуць увагу на канцэрт Берлінскай акадэміі старажытнай музыкі «Музыка на вадзе». З ім упершыню ў Мінску выступіць адзін з найбольш значных аркестраў Германіі, якія спецыялізуюцца на выкананні музыкі барока — Берлінская акадэмія старажытнай музыкі *(скарочана)*. Творы будуць выконвацца на інструментах той эпохі ці іх копіях. Канцэрт «Духоўныя кантаты» прысвечаны 330-годдзю з дня нараджэння Іагана Себасцьяна Баха. Як вядома, духоўныя кантаты займаюць важнае месца ў мастацкай спадчыне кампазітара. У адрозненне ад твораў для аргана, фартэпіяна ці скрыпкі, якія часта выконваюцца, кантаты застаюцца амаль невядомымі не толькі для аматараў, але і прафесійных музыкантаў на постсавецкай прасторы. Таму беларускі ансамбль «Камерныя салісты Мінска» выканае падчас канцэрта чатыры з больш чым двухсот духоўных кантат Баха. А вось публіка рэпера і хіп-хопера Алекса Ліса — моладзь і падлеткі. Ён выступіць з канцэртам і праўдзе майстар-клас па рэпе для школьнікаў і студэнтаў, якія вывучаюць нямецкую мову.

На вечарах нямецкага кіно гледачам будзе паказана пяць вядомых мастацкіх фільмаў, якія былі зняты ў апошнія гады ў Германіі і набылі вядомасць. У Мінску таксама пройдзе фестываль каротка-метражных фільмаў.

Тыдні, па агульным меркаванні, чарговы раз пацвердзяць не новы, але бясспрэчны тэзіс, што культура — гэта таксама пасол міру.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

# СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.38 | 18.11 | 10.33 |
| Віцебск — | 7.30 | 17.59 | 10.29 |
| Магілёў — | 7.29 | 18.01 | 10.32 |
| Гомель — | 7.23 | 18.00 | 10.37 |
| Гродна — | 7.53 | 18.26 | 10.33 |
| Брэст — | 7.51 | 18.30 | 10.39 |

### Месяц

*Маладзік 13 кастрычніка. Месяц у сузор'і Стральца.*

### Імяніны

***Пр.** Васілісы, Дзяніса, Івана.*
***К.** Маргарыты, Фларанцыны, Ядвігі.*



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

# ЗАЎТРА




# Азбука народнай культуры

**ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч**

**Б**ЯДА. Каб не наклікаць бяду. З пакалення да пакалення перадаваліся правілы паводзін у сям'і, у момант правядзення сямейна-родавых святаў ці паўсядзённага жыцця, каб абараніць сябе і сваіх родных ад заўчаснай смерці, г.зн. «не наклікаць бяду»:

◈ Катэгарычна забаранялася браць сабе што-небудзь з магілы ці могілак — гэта значыць прынесці ў хату новую бяду.

◈ Пад страхам смерці забаранялася самому высякаць дрэвы на магілах родных і сваякоў.

◈ Каб не страціць здароўе, пасля смерці роднага чалавека забаранялася кантактаваць з яго фотздымкамі на працягу 40 дзён, а лепш — год.

◈ Забаранялася ўвечары месці ў хаце падлогу. Казалі так: кагосьці роднага «вымецеш назаўсёды». Не дазвалялася, каб падлогу мялі адначасова два чалавекі двума венікамі.

◈ Забаранялі месці падлогу пры нябожчыку. Казалі так: хутка «вынесеце» з хаты ўсіх астатніх. Вымятаць і мыць падлогу дазвалялася толькі тады, калі пахавальная працэсія з нябожчыкам пайшла на могілкі. А выносіць смецце і выліваць брудную ваду дазвалялася толькі тады, калі людзі вернуцца з могілак.

◈ Не раілі браць хросных бацькамі людзей з такімі ж імёнамі, як і ў бацькоў хросніка. Лічылася, што ў такім выпадку хросныя бацькі хутка «заменяць» родных.

◈ Ніколі не давалі імён бацькоў дзецям (каб хутка не страціць бацькоў), а толькі праз пакаленне: унукам імёны дзядоў (каб жыла дынастыя імёнаў роду).

◈ Па недарэчнасці ці па асабістым неразуменні, нават жартам, ніколі і нікому не жадайце смерці. Гэты праклён можа павярнуцца супраць вас.

## ■ Ведай нашых!

# МОДНЫ ТРЭНД МАЛАДЫХ ДЫЗАЙНЕРАЎ

**Шэсць маладых дызайнераў-фіналістаў Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу «Млын моды» прадставілі Беларусь на XI міжнародным конкурсе маладых дызайнераў «Рускі сілуэт» у Маскве. На подыуме ў Гасціным двары дэфілявалі і беларускія мадэлі «Млына моды» — выхаванцы подыум-школы FashionStyle (кіраўнік — Ігар Іваноў) Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.**

Паказ з 67 калекцый праляцеў на адным дыханні. Дзве тысячы гасцей і сотні журналістаў зачаравана назіралі за шоу, створаным натхненнем маладых талентаў з Расіі, Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кіргізіі, Латвіі, Літвы, Эстоніі, Чарнагорыі і Кітая.

Па выніках фестывалю дызайнеры «Млына моды» Ганна Забеліна і сёстры Былеўскія атрымалі магчымасць стажыроўкі ў маскоўскім ЦУМе, супрацоўніцтва з расійскімі моднымі выданнямі і права ўдзельнічаць у Тыдні моды ў Маскве.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

## ■ Не прапусці!

# РЭПАРТАЖЫ З КРЫМА

«Мінская хваля» — удзельнік 2-й Міжнароднай асамблеі маладых журналістаў, арганізаванай Медыякангрэсам журналістаў Еўропы і Азіі. Спецыяльны карэспандэнт радыёстанцыі Алена Магільніцкая прадстаўляе Беларусь на прэстыжным форуме. Ён праходзіць у Крыме. Усяго ў асамблеі бяруць удзел прадстаўнікі 18 краін, у тым ліку Расіі, Грэцыі, Сербіі, Венгрыі, Малдовы і іншых. Асноўная задача форуму — паказаць Крым, распавесці пра тое, чым жыве паўвостраў сёння. Праграма асамблеі акрамя семінараў і «круглых сталоў» вельмі насычаная. Рэпартажы Алены Магільніцкай з месца падзей — у выпусках навін і штодзённай выніковай інфармацыйна-аналітычнай праграме «Кстати» на «Мінскай хвалі».






# УСМІХНЕМСЯ

**Пятніца.**
**21.00. Сумная слабая і безабаронная дзяўчына зайшла ў бар...**
**0.00. Вясёлая моцная і незалежная жанчына з мужыком пад пахай выйшла з бара!**

— Вова, я табе не казала, што ты ў мяне найлепшы?
— Не!
— Што ж такое, і каму ж я ўчора гэта казала?!

**Ён: «О, божухна, яна пагадзілася пайсці са мной у кавярню, я ёй дакладна падабаюся!»**
**Яна: «О, дармавая піца!»**

Хлопец апынуўся з дзяўчынай удвух у кватэры.
— Не, Вадзік, давай проста застанемся сябрамі!
— Добра, Люся, тады хуценька зганяй у краму па піва, а я пакуль дзяўчат паклічу.




caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.975. Індэкс 63850. Зак. № 4100.
Нумар падпісаны ў 19.30 15 кастрычніка 2015 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12